ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР
9 лютага
1995 года
№ 2(1720)

● ЮБІЛЕІ

ВІНШУЕМ!

У студзені гэтага года рэктар нашага універсітэта акадэмік АН Беларусі Фёдар Мікалаевіч Капуцкі адзначыў сваё 65-годдзе. З гэтай нагоды мы жадаем Фёдару Мікалаевічу здароўя і поспехаў ва ўсіх добрых справах. Пра тое, што ён паважаны чалавек не толькі ў нашай альма-матэр, але і сапраўдны аўтарытэт у навуковым асяродку краіны, сведчыць урадавая тэлеграма за подпісам Прэзідэнта Беларусі з вінша-ваннямі ў адрас Фёдара Мікалаевіча.



ПРАВИТЕЛЬСТВЕННАЯ ТЕЛЕГРАММА

ТЕЛЕГРАММА

МІНСК 10/ЧОЗ 04 10/1 1700=

УРАДАВАЯ Г МІНСК ПР-КТ Ф СКАРЫНЫ БДУ ІМЯ У І ЛЕНІНА КАПУЦКАМУ Ф М=

ПАВАЖАНЫ ФЁДАР МІКАЛАЕВІЧ!

ПРЫМІЦЕ ШЧЫРЫЯ ВІНШАВАННІ І САМЫЯ ДОБРЫЯ ПАЖАДАННІ Ў СУВЯЗІ З ВАШЫМ 65-ГОДДЗЕМ

ЖАДАЮ ВАМ НОВЫХ ПОСПЕХАЎ Ў ДАЛЕЙШЫМ РАЗВІЦЦІ ФЛАГМАНА

ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ТВОРЧЫХ ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ Ў ВАШАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ

ДЗЕЙНАСЦІ МОЦНАГА ВАМ ЗДАРОЎЯ ШЧАСЦЯ НАТХНЕННЯ ВА ЎСІХ

СПРАВАХ ПРЭЗІДЭНТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ А ЛУКАШЭНКА

ПАВАЖАНЫ ФЁДАР МІКАЛАЕВІЧ!

Прыміце шчырыя віншаванні і самыя добрыя пажаданні ў сувязі з Вашым 65-годдзем. Жадаю Вам новых поспехаў у далейшым развіцці флагмана вышэйшай школы Беларускага дзяржаўнага універсітэта, творчых здзяйсненняў у Вашай педагагічнай дзейнасці, моцнага Вам здароўя, шчасця, натхнення ва ўсіх справах.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА

Фотаздымак Аляксея Супруна

● АКТУАЛЬНА

НАШ ЗАРОБАК

26 студзеня адбыўся мітынг прафсаюзаў на плошчы Свабоды ў Мінску. Перад гэтым на імя Прэзідэнта Беларусі Лукашэнка А. Р. быў накіраваны ліст ад Рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. У ім, у прыватнасці, гаворыцца, што з 1 студзеня 1994 года рэгуляванне заробку педагагічных работнікаў сістэмы адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з артыкулам 34 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», які прадугледжвае, што сярэдняя стаўка заробку педагагічных работнікаў вызначаецца не ніжэй сярэдняга заробку службоўцаў у прамысловасці, а прафесарска-выкладчыцкага саставу ВНУ — мінімум у паўтара раза вышэй за гэты ўзровень.

Аналіз статыстычных дадзеных і дзейных ставак заробку педагагічных работнікаў, службовых акладаў прафесарска-выкладчыцкага саставу за I, II і III кварталы 1994 года, праведзены Рэспубліканскім камітэтам прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Беларусі (афіцыйна зацверджаная методыка разліку сярэдняй стаўкі адсутнічае), паказвае, што ні ў адным квартале бягучага года артыкул 34 Закона аб адукацыі ў частцы гарантаванага ўзроўню аплаты працы выкананы не быў (табліца № 1).

Меры, якія прымаліся ўрадам, былі недастатковымі і не забяспечылі выкананне Закона.

Больш за тое, у бягучым годзе не толькі стаўка, але нават сярэдні заробак педагагічных работнікаў не дасягаў сярэдняга заробку службоўцаў у прамысловасці (табліца № 2), а ў трэцім квартале склаў толькі 58,8 %. Такі ўзровень аплаты працы прывёў да збяднення педагагічных работнікаў, узмацнення адтоку з галіны спецыялістаў, зніжэння якасці адукацыі і вядзе да нарастання разбуральных працэсаў у галіне.

Для рэалізацыі артыкула 34 Закона аб адукацыі неабходна правесці карэкціроўку ставак заробку і службовых акладаў педагагічных работнікаў: за I квартал — у 1,8 раза, за II квартал — у 2,2, за III квартал — у 2,7; а прафесарска-выкладчыцкага саставу — у 1,6; 2,0; 2,1 разы адпаведна.

Аднак такая карэкціроўка Дзяржкампрацай, цяпер Міністэрствам працы, праведзена не была.

Прэзідыум Рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, рэалізуючы прадастаўленыя заканадаўствам правы па абароне сацыяльна-эканамічных інтарэсаў членаў прафсаюза, 29 кастрычніка гэтага года звярнуўся ў Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь з патрабаваннем аб правядзенні кампенсацыйных выплат за I, II, III кварталы і прыняцці мер па забеспячэнні выканання артыкула 34 Закона аб адукацыі ў IV квартале 1994 года.

Аднак Урад рэспублікі прадэманстраваў прававы нігілізм і адмовіў прафсаюзу ў задавальненні законных патрабаванняў.

Прэзідыум прафсаюза папрасіў прыняць меры, якія забяспечваюць выкананне арт. 34 Закона аб адукацыі ў частцы гарантаванага ўзроўню аплаты працы педработнікаў і прафесарска-выкладчыцкага саставу, а таксама правесці кампенсацыйныя выплаты ў сувязі з невыкананнем яго ў папярэдніх квартала бягучага года.

Адначасова гэты ліст інфармаваў, што ў сапраўды катастрафічным становішчы знаходзяцца нізкааплатныя катэгорыі работнікаў, абслуговы персанал устаноў адукацыі. Іх заробак, з'яўляючыся адзінай крыніцай існавання, складае сёння 35—50 тысяч рублёў, што ніжэй за афіцыйна ўстаноўлены дзяржавай нарматыў аднясення грамадзянаў да маламаёмных.

Людзі прыніжаныя, прыгнечаныя, разгубленыя. Сацыяльная напружанасць у працоўных калектывах дасягнула крытычнай рысы.

У гэтай сітуацыі Рэспубліканскі камітэт прафсаюза лічыць неабходным неадкладнае прыняцце мер па павышэнні рэальнага заробку работнікаў адукацыі і аказанню істотнай адраснай падтрымкі маламаёмым.

У выпадку непрыняцця дзейсных мер прафсаюз будзе пастаўлены перад неабходнасцю правесці актыўныя дзеянні, адэкватныя сітуацыі, якая складаецца ў галіне.

Табліца № 1

	I кв.	II кв.	III кв.
Сярэдні заробак службоўцаў у прамысловасці	302702	673306	141799
Сярэдняя стаўка заробку педработнікаў	167000	300000	60000
Сярэдняя стаўка заробку прафесарска-выкладчыцкага саставу	290000	500000	100000

Табліца № 2
(на падставе дадзеных Дзяржкамстата Рэспублікі Беларусь)

	I кв.	II кв.	III кв.
Сярэдні заробак службоўцаў у прамысловасці	302702	673306	141799
Сярэдні заробак педработнікаў	236541	506989	83453
Сярэдні заробак прафесарска-выкладчыцкага саставу	296504	601348	102739

Дадзеныя ў абедзвюх табліцах прыводзяцца ў рублях.



Стыпендыя? Стыпендыя! У вашай кішэні, напэўна, ужо зацерся спіс: на што патраціць гэткія «вялізныя» грошы. Якія эканомныя вы б ні былі, не сумуйце — па дадзеных аналітычнай службы газеты «Беларускі універсітэт», стыпендыі хапае толькі на тры дні. Вынікі даследавання яскрава пацвярджае малюнак Вольгі ХАДАРЭНКА.

РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: фізікі, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў (0,5 стаўкі); метадаў аптымальнага кіравання; тэхналогіі праграміравання; агульнага землязнаўства; тэорыі літаратуры; гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў; нямецкай мовы; фізічнага выхавання і спорту; экалагічнага і аграрнага права; рускай літаратуры; раманскіх і класічных моў;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі: тэорыі літаратуры; гісторыі журналістыкі і літаратуры; раманскіх і класічных моў;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнага выхавання і спорту; раманскіх і класічных моў;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: матэматычнага забеспячэння САПР; матэматычнага забеспячэння АСК.

Тэрмін конкурса — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 26-59-39.

Аб'ява надрукавана ў газеце «Беларускі універсітэт» 9 лютага 1995 года.

● БЯРЫ ДА ГАЛАВЫ

Набудзь яшчэ адну спецыяльнасць і карысныя ўменні!

Студэнты і супрацоўнікі універсітэта запрашаюцца на міжнародныя міжвузаўскія 2-месячныя курсы масажу (класічны, лекавы, кропкавы масаж). Заняткі праводзяцца двойчы на тыдзень у зручны час. Арганізацыйны сход 28 лютага ў 18.00 у аудыторыі 350 галоўнага корпуса. Даведкі па тэл. 68-32-71.

● КАНФЕРЭНЦЫІ

ЗАПРАШАЕ МІНСК

З 21 па 24 лістапада 1995 года ў Мінску адбудзецца міжнародная канферэнцыя «Камп'ютэрныя метады і зваротныя задачы ў неразбуральным кантролі і дыягностыцы». Арганізатарамі канферэнцыі з'яўляюцца Інстытут прыкладной фізікі АН Беларусі, Весекскі тэхналагічны інстытут (Вялікабрытанія), Федэральны інстытут даследаванняў і выпрабаванняў матэрыялаў (Германія), Беларуская асацыяцыя неразбуральнага кантролю і тэхнічнай дыягностыкі, Нямецкае таварыства неразбуральнага кантролю. На канферэнцыі будзе прадстаўлена наступная праблематыка: фізічныя падыходы да колькаснага неразбуральнага кантролю; зваротныя задачы ў неразбуральным кантролі для магнітных, электрамагнітных, ультрагукавых, акустычных і іншых метадаў кантролю; прамысловая тамаграфія: тэорыя і дадаткі; распазнаванне вобразаў; штучны інтэлект у неразбуральным кантролі; ідэнтыфікацыя аб'ектаў кантролю; матэматычная апрацоўка працэсаў у неразбуральным кантролі.

Галоўнай задачай канферэнцыі з'яўляецца ўсталяванне карысных сувязяў паміж спецыялістамі розных галін. На канферэнцыі будуць прадстаўленыя апошнія дасягненні ў гэтай галіне ў выглядзе запрошаных дакладаў, вусных паведамленняў і стэндавых дакладаў.

Па падрабязную інфармацыю звяртацца на адрас: 220072, Беларусь, Мінск, вул. Ф. Скарыны, 16, Інстытут прыкладной фізікі АНБ, Князеву М. А.

СТЫПЕНДЫІ АД СОРАСА

Джордж Сорас прыняў рашэнне выдзеліць значныя сродкі на падтрымку сярэдняй і вышэйшай школы. У жніўні 1994 года Савет Міжнароднай Сорасаўскай праграмы адукацыі ў галіне дакладных навук аб'явіў аб адкрыцці ў Беларусі падпраграмы «Студэнты — Сорасаўскія стыпендыяты», галоўнай мэтай якой з'яўляецца падтрымка лепшых студэнтаў ВНУ Беларусі. Прыемна адзначыць, што пасля падвядзення вынікаў сярод Сорасаўскіх стыпендыятаў 81 — студэнты нашага універсітэта.

ЛЮТЫ

1924

14 лютага Праўленне універсітэта прыняла рашэнне аб стварэнні музея гісторыі першабытнай культуры і рэлігіі.

21 лютага. Замест Тацьяніна дня студэнты святкавалі Дзень рэвалюцыйнага студэнцтва. У БДУ адбыўся сход партыйных, прафесійных студэнцкіх акадэмічных арганізацый.

1926

11 лютага. Сярод архітэктараў Мінска аб'яўлены конкурс на праект будынка універсітэта.

1928

СНК БССР зацвердзіў праект будаўніцтва універсітэцкага гарадка. Праект прадугледжваў будаўніцтва больш 16 аб'ектаў (галоўны аўдыторны, анатамічны, бібліятэчны, астранамічны карпусы).

1951

У БДУ на 6 факультэтах навучаюцца больш 1770 студэнтаў.

1953

Пачалося будаўніцтва двух інтэрнатаў па вул. Бабруйскай.

1966

БДУ прыняты ў члены Міжнароднай Асацыяцыі Універсітэтаў.

Станіслаў Шушкевіч:
«Пасьянс для мяне лепш, чым аспірын»



У архіве газеты «Беларускі універсітэт» я знайшла цікавае Пасведчанне, выдадзенае* Станіславу Станіслававічу Шушкевічу *дзесяцігоддзе назад, 15 снежня 1984 года. Яго прад'явіцель, напрыклад, абавязваўся «быць чалавекам нават у нечалавечых умовах», яму давалася такая парада: «Калі хочаш, каб на цябе ніколі не падаў цень, не шукай месца пад сонцам» і г. д. З гэтага жартаўлівага пасведчання і пачалася наша размова з Шушкевічам.

— Станіслаў Станіслававіч, адзін з пунктаў Пасведчання абавязвае Вас не губляць пачуцця гумару нават на пасяджэннях Вучонага Савета...

— Цяпер бы я дадаў: і Вярхоўнага Савета. Гляджу на наш Вярхоўны Савет і прыемна, што тое-сёе ён ужо разумее. Але вельмі позна прыходзіць да яго гэтая цямлівасць.

А пра Пасведчанне мне сапраўды прыемна ўспомніць: яно было складзена ў Клубе вучоных універсітэта, які літаральна некалькі разоў збіраўся ў Доме літаратара. На кожнай з такіх сустрэч, а збіралася каля сотні чалавек, абіралі прэзідэнта Клуба тэрмінам да наступнай сустрэчы. Мяне, памятаю, абіралі на гэтую пасаду аж два разы.

— Станіслаў Станіслававіч, Вы спадзяецеся, што самае лепшае ў жыцці яшчэ наперадзе?

— Канешне. І прыкладам для мяне заўсёды былі мае бацькі — перанесці цярпліва такія шалёныя цяжкасці, не скардзіцца, захаваць свой гонар. А радасці ў жыцці мяняюцца. Я цяпер амаль кожны дзень заходжу да ўнука. Ведаеце, мне сапраўды вельмі цікава назіраць, як ён расце.

— Вы, па пасведчанню, маеце «права на адпачынак у любым відзе транспарту»...

— Так. Я памятаю, што ад універсітэта да дома ў тралейбусе я заўсёды спаў. І прачынаўся на сваім прыпынку. Толькі адзін раз праехаў.

— Станіслаў Станіслававіч, Вы гуляеце ў якія-небудзь гульні ці толькі калекцыніруеце калоды карт?

— Калекцыяніраванне — гэта гучна. Не, карты для мяне — проста забава. Але мне прыемна, што маю такія калоды, якіх няма ў некаторых палітыкаў, прыхільнікаў такой забавы, з Еўрапарламента. А што да гульняў — дык гуляю толькі сам з сабою: пасьянс для мяне — лепш, чым аспірын.

— А як Вы ўспрымаеце цяпер такую параду: «Ёсць перыяды ў жыцці, калі лёс, абставіны і нават людзі да Вас добразычлівыя; не трэба хвалявацца: гэта пройдзе...»?

— Я ніколі не захапляўся прыхільнымі адносінамі да сябе. Мая новая работа не дала мне новых сяброў. Але я ганаруся тым, што не страціў старых...

Таццяна КАЗАК.

Поўны тэкст пасведчання глядзіце ў газеце «Беларускі універсітэт» за 6 кастрычніка 1994 года.

● ФЕСТЫВАЛІ

Ведай нашых!

Каманда КВЗ Беларускага дзяржаўнага універсітэта ўжо другі раз прымала ўдзел у міжнародным фестывалі клубаў вясёлых і знаходлівых. Фестываль быў арганізаваны аб'яднаннем «АМИК» (Аляксандр Маслякоў і Кампанія) і адбыўся ў Сочы ў студзені гэтага года.

З 90 каманд, якія змагаліся за права выступаць у заключным гала-канцэрце, былі прызнаныя лепшымі і адабраныя 22, сярод якіх апынулася і каманда Белдзяржуніверсітэта. І яна ж была вызначана для гульні ў гэтым сезоне ў Клубе вясёлых і знаходлівых.

— Што паўплывала на поспех вашай каманды? — пытаю ў Сяргея ТУРБАНА, іграка каманды.

— Момант шчаслівага выпадку, індывідуальныя рысы кожнага іграка і свой асабісты стыль.

А яшчэ, на мой погляд, вельмі значнае і тое, што каманда дружная і вясёлая не толькі на сцэне, але і ў жыцці. Разам ходзяць на шашлыкі, сябруюць з іншымі камандамі, напрыклад, з камандай ХАІ (Харкаўскага авіяцыйнага інстытута). Разам з ёй будуць выступаць 22 красавіка ў Маскве на 1/8 фінала.

А яшчэ падчас фестывалю ў Сочы адбыўся семінар па КВЗ-газеце, на старонках якой са сваёй творчасцю выступяць і тыя каманды, якім не пашчанавала іграць у Клубе ў гэтым сезоне. Газета абяцае быць вельмі цікавай. Яна будзе выходзіць у Маскве, аднак праз студэнцкі клуб нашага універсітэта плануецца распаўсюджваць яе і ў Мінску.

Тэлевізійная трансляцыя фестывалю адбудзецца 12 лютага.

К. ТКАЧЭНКА

● САКРЭТ ФІРМЫ

Аналітычная група прафсаюза «Студэнцкая абарона» (Расія) у адным з апошніх сваіх даследаванняў прыводзіць наступныя факты:

паводле дадзеных сацыялагічных апытанняў, у 1993 годзе 11 % студэнтаў часта адчувалі голад;

надзвычай нізкі ўзровень жыцця сем'яў супрацоўнікаў ВНУ: 72 % з іх — за рысай беднасці;

калі ў 1987 годзе 41 % старшакласнікаў збіраўся паступаць у ВНУ, то зараз ахвотных атрымаць добрую адукацыю сярод школьнікаў толькі 24 %;

калі ў 1989 годзе толькі 28 % студэнтаў лічылі жыццё бессэнсоўным, то ў 1994 годзе захандрылі ўжо 58 %.

* * *

Вучоная рада Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта ўстанавіла тры стыпендыі імя Фёдара Міхайлавіча Янкоўскага. Іх будуць атрымліваць студэнты, якія вызначаюцца як знаўцы беларускай філалогіі, культуры і гісторыі Беларусі, а таксама прымаюць актыўны ўдзел у навуковай працы.

● КАМПЕТЭНТНА

ІНАВАЦЫЙНАЯ СІТУАЦЫЯ

Да вашай увагі — вытрымкі з матэрыяла, распаўсюджанага БелаПанам у аналітычным штотыднёвіку.

У спадчыну ад СССР Рэспублікі Беларусь дасталася неэфектыўная энерга- і рэсурсаёмістая эканоміка, нізкі жыццёвы ўзровень краін трэцяга свету, але дастаткова магутная навука і прыстойная сістэма прыродазнаўча-навуковай адукацыі, уласцівая багатым дзяржавам. Ад умення захаваць, павялічыць і правільна выкарыстаць гэта, траха не адзінае наша багацце, залежыць: адбудзецца ў Беларусі татальная дэіндустрыялізацыя і яна скоціцца далей у трэці свет або ўстане на шлях Іспаніі, Чэхіі, Польшчы і пачне паступовую інтэграцыю з высокаразвітымі дзяржавамі.

Адзіны шанц Беларусі — хутка перайсці ад эканомікі, заснаванай на цяжкой прамысловасці, да эканомікі, якая арыентуецца на інфармацыю, найноўшую тэхніку і тэхналогію, сродкі сувязі і паслугі. А гэта патрабуе неадкладнага падаўлення інфляцыі шляхам жорсткага падпіхвання фінансавых патокаў у інвестыцыі, у навукаёмістую прамысловасць. Але калі мы будзем гэта рабіць традыцыйнымі дзяржпланаўскімі метадамі фінансавання мэтавых праграм, то ў чарговы раз грошы будуць патрачаныя марна. Ніжэй мы спынімся на новых эфектыўных формах інавацыі, прынятых ва ўсім свеце. Але спачатку крыху аб цяперашняй сітуацыі ў сектары НДРВКР.

Мы вельмі доўга не ўсведамлялі, што Беларусь — малая краіна, падобная да Грэцыі, Балгарыі, Партугаліі і, будзем спадзявацца, Швецыі, і што рэгуляванне эканомікі малой краіны мае сваю спецыфіку і свае асаблівасці. Малая краіна можа канкурыраваць з буйнымі дзяржавамі, толькі маючы гнуткую, мабільную і навукаёмістую структуру сваёй гаспадаркі. Звычайна развітая малая дзяржава мае два-тры буйных транснацыянальных прадпрыемствы тыпу Вольва, АББ (у нас гэта маглі б быць трактарны, халадзільнікаў, аўтамабільны) і масу прадпрыемстваў, якія даюць малатыражную і унікальную прадукцыю (кшталту калёсных цягачоў) для «нішавых» сфер сусветных рынкаў. Малая краіна можа вытрымаць канкурэнцыю на сусветным рынку, толькі пастаянна ўкараняючы новаўвядзенні, апярэджваючы іншых. У малых дзяржаў, калі толькі яны не хочуць заставацца вытворцамі бананаў і рыдлёвак, павінны быць вялікім траты на адукацыю і навуку. Доля ж выдаткаў на навуку ў дзяржбюджэце Беларусі няўхільна змяншаецца: 1990 г.— 4 %, 1991 г.— 2,2 %, 1992 г. — 2,2 %, 1993 г.— 2 %, 1994 г.— 1,3 %, 1995 г.— 2,5 %. Сумарныя выдаткі на навуку і адукацыю маюць такую дынаміку: 1985 г.— 16,5 %, 1989 г.— 14,5 % 1992 г.— 16,9 %, 1993 г — 8,08 %, 1994 г — 5,5%, 1995 г. (праект — 7,2 % (у расходнай частцы).

Аналіз цяперашняга стану ў Беларусі дазваляе рабіць выснову, што стыхійна адбываецца імклівае разбурэнне назапашанага навукова-тэхнічнага патэнцыялу: дзяржава ў выглядзе ВПК перастала выступаць у якасці актыўнага заказчыка навукова-тэхнічнай прадукцыі, а прадпрыемствы, якія знаходзяцца ў крызісным стане, таксама амаль поўнасцю спынілі ўкараненні новых тэхналогій і фінансаванне навуковых распрацовак. Значнае скарачэнне вытворчасці на фоне адсутнасці эфектыўных форм падтрымкі інавацыйнай дзейнасці і правядзення канверсіі праводзіць да распаду навукова-тэхнічнага патэнцыялу.

Адсутнасць канкурэнцыі, якая прымушае змяняць выдаткі вытворчасці за кошт інавацый, неразвіты рынак інтэлектуальных прадуктаў, адсутнасць вопыта продажу ноў-хаў за мяжу пагаршаюць становішча. Да таго ж дастаткова высокі ўзровень навукі дасягаўся ў нас не выдатнай яе арганізацыяй і эфектыўнай сістэмай падтрымкі талентаў, а празмерным напружаннем эканомікі для фінансавання ваенных даследаванняў. У выніку структура навукі ў Беларусі надзвычай перакрыўленая, пераўцяжарана даследаваннямі, якія прэтэндуюць на ролю фундаментальных, і даследаваннямі ў інтарэсах абарончага, касмічнага, машынабудаўнічага комплексаў. Практычна на нулявым узроўні знаходзяцца навуковыя тэхналогіі па вытворчасці тавараў народнага спажывання, аграхарчовай прадукцыі. Такая структура абсалютна не прыдатная для рыначнай эканомікі — непазбежнае скарачэнне колькасці занятых у навуцы. Гэта павінна быць здзейснена ў першую чаргу за кошт тэхнічнага і адміністрацыйнага персаналу, а таксама той часткі галіновай навукі, якая не мае шанцаў выйсці на сусветны ўзровень. Паводле нашых ацэнак, не больш за 15 % спецыялістаў галіновай навукі і каля 20 % фундаментальнай навукі здольныя працаваць на сусветным узроўні, не больш за 10 % сродкаў, якія ўкладаюцца ў навукова-тэхнічныя праграмы, прыводзяць да стварэння інавацыйных тэхналогій. Аднак, ва ўмовах стыхійных скарачэнняў у навуцы існуе небяспека паздбаўлення не ад баласту, а якраз ад тых навукоўцаў, якія працуюць на сусветным узроўні. У выніку можа здарыцца так, што ў навуцы застануцца тыя, хто не здольны ў ёй працаваць. Заўважана, што ў перыяды эканамічнага спаду універсітэты заходніх краін істотна пашыраюць прыём студэнтаў, а навуковыя фонды павялічваюць фінансаванне. Парадокс? Не. Па-першае, прадухіляецца сацыяльны выбух і беспрацоўе, па-другое, разумныя кіраўнікі з часоў Рузвельта рыхтуюць краіну да новага рыўка. На жаль, нашыя рэфарматары захапіліся знешнім бокам: у чарговы раз прапануецца змяніць тэрміны навучання ў школе, чамусьці ўводзяцца чужыя нам ступені бакалаўра, магістра (Германія цудоўна абыходзіцца без іх), пад маркай гуманітарызацыі адукацыі былыя выкладчыкі гісторыі КПСС адваёўваюць гадзіны ў дакладных і інжынерных навук, празмерны ўхіл у падрыхтоўку спецыялістаў па менеджменту і маркетынгу (цікава, чым яны будуць гандляваць, калі не будзе навукоўцаў і тэхналагаў для мадэрнізацыі прадукцыі).

Уяўляецца, што найлепшы спосаб структурнай перабудовы фундаментальнай навукі — эвалюцыйны, пры якім пры захаванні татальнага фінансавання ўстаноў, што ўсё памяншаецца, адбываецца пераход да конкурснага фінансавання, селектыўнай падтрымкі з розных фондаў праектаў, калектываў, асобных таленавітых навукоўцаў. Фактычна гэты працэс пачаўся.

Створаны і дастаткова эфектыўна дзейнічае Фонд фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь. Немінуча пачаўся працэс пераўтварэння Акадэміі навук у інавацыйны тэхнаполіс, які складаецца з невялікіх фундаментальных інстытутаў, дзе будуць сканцэнтраваныя навукоўцы сапраўды сусветнага ўзроўню і сотні фірм па вытворчасці навуковаёмістай канкурэнтнай прадукцыі. Структурна-прыкладныя навуковыя ўстановы з часам увойдуць у склад тэхнапаркаў, універсітэтаў, вытворчых структур, стануць прыватнымі ці спыняць існаванне. Паралельна, ва ўмовах рэзкага абмежавання аб'ёмаў фінансавання прыкладных навуковых даследаванняў, згортвання інвестыцыйнага працэсу, незапатрабаванасці эканомікай навуковых распрацовак, крайне важна знайсці формы фінансавання адэкватныя рыначным трансфармацыям.

Розныя падачкі з разнастайных фондаў — гэта адцягванне нашай смерці. Неабходна вучыцца жыць у новых умовах, засвойваць механізмы міжнароднага падзелу працы ў навуцы, змагацца нароўні з лепшымі навуковымі лабараторыямі свету за фірменныя кантракты, за ўдзел у міжнародных праектах. У навуцы няма і не можа быць нацыянальных межаў, павінна быць толькі цывілізаванае права інтэлектуальнай уласнасці (аўтара і ўласніка распрацоўкі, ім можа быць і дзяржава) і рыначная цана распрацоўкі. Грамчэй за ўсіх звычайна крычаць аб «продажы навуковых сакрэтаў» тыя, каму пры ўсіх іх высокіх званнях і рэгаліях ніколі не было чаго прадаваць.

Так, найважнейшая праблема 1995 года — працягнуць селектыўную палітыку ў фундаментальных даследаваннях, ажывіць фінансаванне навуковаёмістага сектара эканомікі, паглыбіць змест адукацыі заміж змены форм. Ва ўмовах эканамічнага крызісу праблемы стварэння рыначных інавацыйных структур становяцца яшчэ больш вострымі, інакш імклівыя тэмпы інфляцыі, скарачэнне рабочых месцаў,

● ДЛЯ ЦЯБЕ

ШТО РОБІЦЬ ЧАЛАВЕКА ПАПУЛЯРНЫМ?

Эксперты разглядаюць папулярнасць па двух напрамках. Да аднаго адносяцца людзі, якія з'яўляюцца элітай грамадства. Другі аб'ядноўвае тых, хто папулярны ў людзей з такім жа сацыяльным становішчам.

У адпаведнасці з Томасам Бэрнтам, прафесарам псіхалагічных навук, папулярнасць дасягаецца шляхам тваіх дзеянняў. Многім здаецца, што, калі ты фізічна прывабны, багаты, маеш высокі сацыяльны статус, безумоўна, будзеш папулярным»,— гаворыць Томас Бэрнт, але даследаванні паказваюць, што твае агульныя паводзіны больш важныя.

Добрыя чалавечыя якасці, самапавага, пачуццё гумару, своеасаблівасць — вось сакрэты папулярнасці.

Добрыя чалавечыя якасці. Здольнасць падтрымліваць размову, пазбягаць канфліктаў, пазітыўна ўплываць на іншых і таксама лідэрскія здольнасці — усё гэта атрыбуты папулярнасці.

Самапавага. Вывучэнні паказваюць, што самапавага і папулярнасць узаемазвязаны. Паважай сябе — і цябе будуць паважаць іншыя.

Своеасаблівасць. Кожны чалавек асаблівы, унікальны, але каб быць сярод найбольш папулярных, табе прыйдзецца патраціць час, каб вызначыць лепшае ў сабе і развіць гэта. Калі ты думаеш, што ў цябе няма нічога асаблівага, памятай, што ніколі не позна навучыцца новаму ўмельству або ўдасканаліць сябе.

Пачуццё гумару. Не кожны можа быць душой кампаніі, але калі ты жадаеш павялічыць сваю папулярнасць, майна ўвазе некалькі саветаў, якія дапамогуць прайсці такія грамадскія выпрабаванні. Папулярныя дзеткі ведаюць, як проста рассмяшыць людзей. Лепшы шлях — трымацца каля людзей схільных да гумару і вучыцца ад іх. Калі няма такіх людзей — назірай і знаёмся.

Маральнасць. Папулярнасць, якую я апісваю, асацыіруецца з пазітыўнымі дзеяннямі, наколькі чалавек заслугоўвае даверу. У адпаведнасці з даследаваннямі, давер — падмурак для пабудовы сяброўскіх зносін. Захаванне сакрэтаў, дабрадушнасць, дзе няма месца плёткам,— усё гэта падпадае пад катэгорыю даверу.

Супрацоўніцтва. Калі хтосьці папросіць цябе пайсці, напрыклад, у кіно, чаго ты не вельмі хочаш рабіць,— ты не падасі выгляду і не падвядзеш таварыша, пойдзеш з ім. Калі ты хочаш быць папулярным, падатліваць характару вельмі спатрэбіцца табе.

Сацыяльнае асяроддзе. Павялічвай сваё сацыяльнае асяроддзе і знаходзь сяброў, якія падзяляюць твае інтарэсы. Есць шмат розных груп людзей, аб'яднаных агульнасцю інтарэсаў, напрыклад, у музыцы, спорце, рэлігіі. Каб стаць папулярным, табе трэба добра разабрацца ў каштоўнасцях дадзенай групы.

Напэўна, кожны чалавек жадаў бы ганарыцца сабой, быць папулярным. Чаму ж у аднаго гэта атрымліваецца, а ў другога не? Ці існуе нейкая сакрэтная формула папулярнасці? Або гэта капрыз лёсу?

Папулярнасць прыходзіць да таго, хто можа выбраць і ўжываць усё лепшае з уласных унутраных рэсурсаў.

Што Вы робіце не так, як папулярныя людзі? Сумленна ахарактарызуйце сябе самі, адказаўшы на наступныя пытанні.

1. Калі я бываю ў кампаніі, я...

а) рэдка размаўляю, таму што баюся і не магу нічога сказаць;

б) жартую, каб збавіць напружанне;

в) назіраю за людзьмі і стараюся далучацца да размовы.

2. Нядаўна мне даверылі сакрэт, і я...

а) трымаў яго ў таямніцы і нікому не сказаў;

б) расказаў пра яго ўсім;

в) не расказаў яго, але намякнуў іншым, бо я жадаў бы мець дачыненне да яго.

3. Калі я заўважыў непрывабную дзяўчыну, якой вельмі патрэбна дапамога, я...

а) пазбягаю яе, бо асацыяцыя з ёй можа пашкодзіць маёй рэпутацыі;

б) падыходжу да яе і дапамагаю, таму што быў час, калі мне таксама была патрэбна дапамога;

в) па-сяброўску стаўлюся да яе, але ў асноўным трымаюся ўбаку, бо не жадаю праводзіць час з чалавекам не майго сацыяльнага кола.

4. Калі я сапраўды веру ў што-небудзь, я...

а) упэўнены, што заўсёды змагу абараніць тое, у што веру. Я не слухаю іншыя меркаванні, калі думаю, што маю рацыю;

б) трымаю свае перакананні пры сабе і стараюся абмінаць людзей, якія сумняваюцца ў іх;

в) трымаюся сваіх перакананняў, у спрэчных пытаннях спрабую даказаць свой пункт гледжання, абавязкова звяртаючы ўвагу на меркаванні іншых людзей.

5. Калі я пасварыўся з сябрам, я...

в) сыходжу, каб не сказаць што-небудзь, што можа пакрыўдзіць яго (яе) пачуцці;

б) крычу і кажу рэчы, аб якіх пасля шкадую;

в) стараюся разабрацца з ім, нават калі на гэта патрабуюцца гадзіны.

6. Размова аб чалавеку за яго спіной ёсць тое, што я...

а) ніколі не раблю;

б) дапускаю, калі гэты чалавек зрабіў штосьці мне;

в) раблю неаднаразова, але спрабую спыніць гэта.

7. Я жыву ў згодзе з маімі настаўнікамі, выкладчыкамі...

а) амаль заўсёды, але нічога не раблю асабліва для гэтага;

б) адзін раз у семестр!

в) заўсёды.

8. Маё стаўленне да папулярнасці зводзіцца да таго, што...

а) папулярнасць не мае значэння, гэта толькі прыкідванне;

б) папулярнасць вельмі важная, надзвычай важная;

в) папулярнасць — натуральны вынік лёгкіх кантактаў з людзьмі, што вельмі дапамагае ў жыцці.

9. Маё пачуццё гумару...

а) даволі добрае. Я часта смяюся з жартаў іншых, але сам не ўмею іх расказваць;

б) добрае: я люблю расказваць гісторыі пра смешныя падзеі, якія здарыліся са мной і з маёй сям'ёй;

в) крыху «заржавела». Я сур'ёзны чалавек, трэба асаблівая сітуацыя, каб рассмяшыць мяне.

10. Я трымаюся ўсіх цяперашніх напрамкаў і стыляў жыцця...

а) чытаючы газеты, гледзячы навіны;

б) ігнаруючы іх. Гэта мяне не цікавіць;

в) слухаючы іншых людзей і назіраючы за ўсім новым. Калі чалавек расказвае нешта невядомае, я стараюся даведацца пра гэта праз самага блізкага сябра або сваякоў.

Адказы:

1. Калі ты выбраў пункт «в», дык ужо маеш уяўленне аб важным майстэрстве — зносін з людзьмі. Калі ты адзначыў «а», паспрабуй слухаць іншых больш уважліва і імкніся далучацца да размовы: калі — «б», ведай, што перагружванне недарэчнымі жартамі можа прывесці да нечаканых і непрыемных вынікаў.

2. Захаванне сакрэтаў вельмі важна: сябры будуць даўяраць табе. Калі ты выбраў «а», тады ты ўжо ведаеш гэта. Калі ты выдасі сакрэт або толькі намякнеш аднойчы, ты можаш згубіць сяброў і нават тых, каго ты імкнуўся здзівіць сакрэтам. Людзі будуць ведаць, што ты ненадзейны. Паразважай аб гэтым, калі ты выбраў «б» або «в».

3. Папулярныя людзі звычайна дапамагаюць іншым. Выбраўшы «б», ты ведаеш, што людзі ўсе важныя, нягледзячы на іх сацыяльны статус. Калі ж твае дзеянні адпавядаюць «а» або «в», ведай, што, дапамагаючы непрывабнаму чалавеку, ты не пашкодзіш сабе, наадварот — гэта дапаможа замацаваць тваю рэпутацыю добрага чалавека.

4. Вельмі важна мець не толькі сваё ўласнае меркаванне, але і прыслухоўвацца да іншых ідэй і ставіцца да іх з павагай. Калі ты выбраў «в», ты маеш добрыя шанцы для падтрымкі гэтага балансу. Калі — «а», старайся глядзець шырэй на рэчы. Калі ж ты згодзен з «б», старайся дзяліцца сваімі перакананнямі з іншымі больш шчыра. Цяжка пазбегнуць усіх, не згодных з табой.

5. Нават калі на гэта патрабуюцца гадзіны, лепей высветліць усё адразу, чым уцякаць ад стрэсавай сітуацыі альбо крычаць і лаяцца.

6. Калі ты выбраў «а», дык ты адчуваеш, што негатыўныя навіны могуць распаўсюджвацца вельмі хутка і могуць сапсаваць тваю рэпутацыю нават больш, чым таго чалавека, якога абгаворвалі. Чым менш ты разводзіш плёткі, тым лепей твая ацэнка ў вачах людзей.

7. Калі ты адзначыў «в» або «а», ты разумееш, як важна быць у добрых стасунках з выкладчыкамі, настаўнікамі, каб атрымаць усё ад вучобы. Выбар «б» гаворыць сам за сябе.

8. Затрымаўшыся на «а», ведай, што папулярнасць можа быць карыснай. Калі ты выбраў «в», ты на правільным шляху. Ведаеш, папулярнасць — гэта і вялікае сацыяльнае майстэрства.

9. Вельмі важна мець добрае пачуццё гумару. Калі ты выбраў «а», тады гэта добры пачатак. Калі ж «б», дык ты маеш усе шанцы, каб зрабіцца папулярным, бо можаш стаць душой кампаніі. Выбраўшы «в», пастарайся ўнесці ў жыццё такую-сякую разнастайнасць, каб людзі не называлі цябе надзьмутым індыкам.

10. Калі ты назіральны чалавек, любіш чытаць, каб даведацца навіны, ты, напэўна, адзначыў «а» альбо «в». Абодва метады працуюць. Калі ты выбраў «б», ведай, што, паступаючы такім чынам, ты мэтанакіравана вядзеш сябе да непрыемных сутычак з навакольнымі.



Пераклад
Вольгі БУКАНАВАЙ
з амерыканскага
часопіса «Teen»
спецыяльна для газеты
«Беларускі
універсітэт».

Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

тыўных інавацыйных праектаў, высокіх тэхналогій?

рэзкае падзенне аб'ёмаў фінансавання прыкладных навуковых распрацовак прывядуць да поўнага разбурэння навуковаёмістай прамысловасці. Толькі стварэнне інавацыйнага сектара эканомікі дазволіць вырашыць задачу структурна-тэхналагічных пераўтварэнняў нацыянальнай эканомікі, выратуе яе ад татальнай дэіндустрыялізацыі. Неабходна стварыць прынцыпова новую інавацыйную інфраструктуру: тэхнапаркі, венчурныя фонды, міжнародныя цэнтры трансфера, інкубатары малых інавацыйных фірм, цэнтры інтэграцыі ў міжнародныя праекты. Сусветны вопыт вучыць, што новыя інавацыйныя структуры выключна ўдала дапоўнілі як традыцыйныя навуковыя структуры (інстытуты, універсітэты, навуковыя падраздзяленні канцэрнаў), так і мэтавыя цэнтралізаваныя навуковыя структуры, якія ствараліся пад буйныя праграмы (атамная, тэрмаядзерная, нейтронная бомбы, «Apollo», «Spaceshatlle», SOI, еўрапейскія міждзяржаўныя праекты AIRBUS, EUREKA, ESPRIT, якія з'явіліся ў перыяд «халоднай вайны» на падставе праграмна-мэтавага метада планавання і кіравання рэсурсамі REPT). У апошнія 20—25 год было зразумела, што манапалізм буйных навуковых структур, як любая планавая эканоміка, тармозіць абнаўленне тэхналогій, накіроўвае перспектыўныя ідэі не на радыкальныя змены, а на мадэрнізацыю і змяншэнне выдаткаў. І ў выніку цэнтралізаваныя структуры былі дапоўненыя рыначнымі механізмамі самарэгулявання. Малыя інавацыйныя фірмы, заснаваныя на прынцыпах канкурэнцыі, стварылі ніжні ініцыятыўны, найбольш рызыкоўны слой, які ўтрымлівае тысячы навуковаёмістых фірм, што бесперапынна ўзнікаюць і больш паловы з іх тут жа паміраюць. Перамяшчэнне часткі навукі ў сферу рыначных адносін рэзка актывізавала прыкладныя даследаванні, а канкурэнцыя хутка адсеяла інтэлектуальных непрафесіяналаў, што накапіліся ў вялікіх мэтавых структурах. Па дадзеных Нацыянальнага навуковага фонду ЗША адзін долар выдаткаў на НДДКР у малых фірмах прынёс нова-ўводзінаў у чатыры разы болей, а ў параўнанні з буйнымі — у 24 разы болей. У некаторых галінах малыя фірмы цалкам дамінуюць, напрыклад, стварэнне праграмнага забеспячэння, генная інжэнерыя. Укараненне рыначных адносін у сферу прыкладной навукі аўтаматычна вырашыла праблемы якасці работы і павышэння кваліфікацыі. Як гэта адбываецца, можна ўжо сёння бачыць і ў нас на прыкладзе распаду неэфектыўных беларускіх камп'ютэрных галіновых НДІ ў невялікія праграмісцкія фірмы.

Стварэнне рыначных інавацыйных структур, якія здольныя адэкватна рэагаваць на змены, уплываць на правядзенне рэструктурызацыі эканомікі, забяспечваць тэхналагічны трансфер і камерцыялізацыю вынікаў навуковых распрацовак — адна з падставаў вываду эканомікі Беларусі з крызісу, важны складнік трансфармацыйнага працэсу.

1. Што з'яўляецца перадумовай інавацыйнага працэсу?

Вопыт краін Усходняй Еўропы і Кітая паказвае, што эканамічны рост у пераходны перыяд забяспечваецца новым недзяржаўным сектарам, як вынік і ўзнікае супрацоўніцтва і фінансаванне навуковых і навучальных цэнтраў прыватным сектарам эканомікі. Прыватныя фірмы за мяжой выдзяляюць на НДДКР значныя сумы, скажам, Siemens выдзеліў у 1992 г. на навуку 5,3 млрд. долараў, што па цяперашняму курсу складае ВУП Беларусі ў 1994 г. Са стварэннем першых інавацыйных фірм кшталту «ВОМА» пры СП «Метинком», «ПРИОР-Инвест», «Дайнова-Інвест», серыі навуковаёмістых фірм, што абслугоўваюць камерцыйныя банкі, міжнароднай навукова-тэхнічнай асацыяцыі пачынаецца гэты працэс і ў Беларусі. Фарміраванне значнага недзяржаўнага і змяшанага сектара гаспадаркі дасць беларускай навуцы новую крыніцу сродкаў. Прыватныя фірмы зацікаўленыя ў канкурэнтаздольным тавары, а атрымаць яго без навукоўцаў немагчыма. Гэта аксіёма сусветнага рынку. Зразумела, што толькі магутныя транснацыянальныя карпарацыі (ТНК) і прамыслова-фінансавыя групы (ПФГ) змогуць ствараць карпаратыўныя венчурныя фонды і па-сапраўднаму фінансаваць інавацыі. Здаецца, пачатковае прымітыўнае захапленне дэманапалізацыяй прамінула і прыйшло разуменне, што толькі манапалісты-флагманы кшталту нашага трактарнага, Атланта, стварыўшы разам з банкамі і інвестыцыйнымі фондамі ў працэсе раздзяржаўлення магутныя ПФГ, змогуць выстаяць у сусветнай канкурэнтнай барацьбе. Тэхніка работы ПФГ па ўкараненню інавацый адпрацаваная і добра вядомая — венчурныя альбо інвестыцыйныя фонды, лізінгавыя кампаніі, франчайз.

2. Як паскорыць працэс стварэння новых інавацыйных структур і венчурных фондаў, здольных выяўляць ноўхаў і ажыццяўляць іх тэхналагічны трансфер? Як прыцягнуць банкаўскі і замежны капітал да стварэння венчурных фондаў?

Усе ільготныя датацыі, крэдыты павінны быць скіраваныя не для падтрымання на плаву банкрутаў, а для новага развіцця, для стварэння інавацыйнай і тэхналагічнай інфраструктуры. Першым крокам да стварэння інавацыйных структур пры ТНК і ПФГ павінен быць паварот універсітэтаў і фінансуемых з дзяржбюджэта даследчыцкіх арганізацый з дапамогай тэхнапаркаў да сярэдняга і малога прадпрымальніцтва.

Стварэнне новых інавацыйных структур у выглядзе сеткі венчурных фондаў, тэхнапаркаў, інкубатараў малых навуковаёмістых фірм, арыентаваных на работу ва ўмовах рыначных адносін, дазволіць захаваць і эфектыўна выкарыстаць навукова-тэхнічны патэнцыял рэспублікі, развіць рынак навуковаёмістых тэхналогій, стварыць умовы для станаўлення прадпрыемстваў і вытворчасцей, арыентаваных на навуковаёмістыя тэхналогіі. Новыя інавацыйныя структуры забяспечаць уваходжанне праз міжнародныя асацыяцыі тэхнапаркаў, інавацыйных цэнтраў і цэнтраў высокіх тэхналогій у сусветны падзел навуковай працы, забяспечыць сусветны ўзровень развіцця тэхналогій і дадуць магчымасць засвоіць цывілізаваныя формы перадачы тэхналогій у прамысловасць, спыніць нелегальны экспарт ідэй, ноў-хаў, тэхналогій. Новыя інавацыйныя структуры ў рэспубліцы забяспечаць падтрымку развіцця недзяржаўных гаспадарчых форм і малога прадпрымальніцтва ў навукова-тэхнічнай сферы, сфарміруюць умовы для камерцыялізацыі навуковых ідэй, дазволяць зрабіць рэальны крок у стварэнні рынка навукова-тэхнічнай прадукцыі.

3. Што стрымлівае сёння такую схему ўкаранення высокаэфектыўных сістэм адбору і рэалізацыі перспек-

Па-першае, адсутнасць заканадаўства ў інавацыйнай сферы: адсутнічае закон аб ахове інтэлектуальнай уласнасці, адсутнічаюць законы і нарматыўныя акты аб падаткавых ільготах тэхнапаркам, аб інвестыцыйных фондах для інавацыі (акты аб галіновых падобных фондах, па сутнасці, толькі далі шчыліну для ўкрывання ад падаткаў — 1 % даходаў на самой справе пайшоў на галіновы апарат). Неабходныя не выключныя ўмовы і пастановы, як з тэхнапаркам на базе НВА «Цэнтр», а агульнае заканадаўства.

Па-другое, неадпрацаванасць механізмаў і ільгот арэнды плошчаў і зямлі малымі навуковаёмістымі фірмамі. Па сутнасці, эфектыўна працуючая частка многіх НДІ і праектных інстытутаў, выплочваючы арэндную плату і іншыя паборы, утрымлівае другую частку гультаёў і празмерны апарат кіраўнікоў навукі, які застаўся ў спадчыну. Выйсце простае — кожнае падраздзяленне пры ўмове выкарыстання па прызначэнню можа ў сваёй установе атрымаць займаемыя плошчы ў арэнду.

Яшчэ раз адзначым, што дзяржавы, якія валодалі невысокім узроўнем эканамічнага развіцця, але змаглі ўключыцца ў актыўны абмен высокатэхналагічнай прадукцыяй на сусветным рынку, змаглі значна паскорыць тэмпы эканамічнага росту. Таму неабходна як мага хутчэй распрацаваць і ўвесці ў практыку заканадаўчыя акты і нарматыўныя дакументы, якія рэгламентуюць стварэнне і функцыянаванне новых інавацыйных структур (тэхнапаркі, венчурныя фонды, цэнтры высокіх тэхналогій), і вызначыць іх асаблівы статус як навуковаёмістых арганізацый вытворчасці, улічваючы іх спецыфіку, рызыкоўны характар дзейнасці.

М. М. КАВАЛЁЎ,
прафесар
БДУ.

МАЙСТРОЎНЯ

Неформальное общество «Мальва»

В одном из прошлых номеров мы рассказали своим читателям о литературном клубе «Мальва», а сегодня предлагаем познакомиться с творчеством «мальвовцев».

Лепестки:

1. Секрет Евгений, рыцарь Мальва.
Пишу недавно, в основном о жизни. Работаю инженером в Лошицком парке.

2. Джон Федорович Балтазаров (Георгий Бартош). Руководитель музыкальной группы «Общество им. Дж. Ф. Балтазарова», теперь не выступающей. Работал учителем истории, ныне — коммерсант. Пишет стихи и музыку к ним.

3. Зоя Ковалёва. Минская поэтесса, покончила жизнь самоубийством в 1993 году, но всегда живая среди нас.

4. Саша Сорокач (Чейз). Исполнитель на шестиструнных инструментах в группе «МОЦ» (40 °С), пишет музыку и стихи.

Это только некоторые из нас. Желающие могут написать нам по адресу: 220099, Минск, а/я 165.

5. Нота СИ (Светлана Ищенко) — в соцветие «Мальвы» вошла недавно. Пишет стихи и прозу в разных жанрах.

Евгений Секрет

ПЕСНЯ

Это ночь, черных масок оскал.
На поручнях петля — это вето трамвая.
Запомни смысл последнего глотка —
Наш грех содержит всю вместимость рая
И даже более того.
Жую печаль, как динамит,
Печально мне, взрывоопасно,
Прогорклый хлеб и сумерки богов,
Любовь, зовущая ненастье,
Звезда влияет на истоки Ян.
За веком век, расплата за расплатой,
Нажмите кропки на изнанке дня.
Заплачено вено́ — больничная палата,
И чистят сабли дети декабря,
Ушли в туман нагие каравеллы...
Пустой чердак — вместимость параллелей,
Дырявит душу мыслепад,
Закрытые пути исхожены народом,
Засыпаны следы, ведущие назад —
Цветы роняют тихоход небесный.

Ноябрь 1994 г.



Рисунок Умной Маши

Так зачем же щемящие душу
Эти черные двери открыл?
«Это я тогда старуху-чиновницу
и сестру ее Лисавету топором убил и ограбил».
Декабрь 1994 г.

* * *

Беру спички и поджигаю сны.
Дым от них мне в усладу.
В награду цветные фильмы.
Я вытащиш крик звездопада
Из пачки оранжевых слов.
А день — поток. Туда — сюда,
Побег зверей из шапито,
Можно выйти назад и напиться.
Тяну вместо сдачи шершавый язык.
Поэт без денег — жалкая птица,
Поэт без денег — просто пустяк.
Впереди на сто лет — пустота.
Рок-жизнь — а ну ее нахрен!
Я просыпаюсь от рёва машин
Где чиста философия Дзен.
Кроме этого, боюсь только смерти.

Зоя Ковалева

* * *

На грани снега и тоски,
Сбиваясь на высокий слог,
Душа завяжет узелки
На память пройденных дорог.
На память зим, на память дат
И не совсем пропащих лет,
Чтобы не канула любовь
В безумьи торжищ и побед.
Чтобы еще отозвалось
В отчаянно щемящем дне,
Где слово ранит наискось,
Где взгляд размажет по стене.
На узелок судьбы молюсь,
Который так меня берег
На перепутии луны,
На новолунии дорог.

Нота СИ

Котлинистрадательно всеми скверняками

Гаубицы.



Рисунок Юрия Матяша.

* * *

Единственное необходимое тебе состояние — это спокойствие.
Твоя единственная защита — осторожность.
Единственное богатство в твоем кармане — стихи, посвященные Учителю.
Единственное качество, встретившееся тебе — великодушие.
Твой единственный путь — к дому, который тебе не принадлежит.

* * *

Если решусь признаться — ни разу не назову слово «любовь».
Если придется опасаться — ни разу не произнесу слово «тревожность».
Неприязнь погружу в молчание, расположение окружу со всех сторон сдержанностью. Тогда всем им действительно не в чем будет уличить меня!

* * *

Медленно идти по длинной желтой дороге между домами.
Снизу вверх смотреть на цветущие ветки.
Кто из вас знает, как болит весной
Сердце, не имеющее хозяина?

* * *

Снова полоса рассеянности.
Забыла часы и сантиметр на работе, книгу в магазине.
Неужели столь глубоким было мое размышление
о хромой серой лошади?

****

ИЗ ЦИКЛА «КЛЕНОВЫЙ ЛИСТ, СЛЕТЕВШИЙ НА ТЕТРАДЬ ДРУГА».

Стакан горячего чая согревает на короткое время.
Старый сад. Отсыревшая избушка поджала курьи ножки.
Близко зима.
Осенняя природа благоприятствует терпению.
Яркие кленовые звезды под ногами погасли, пожухли.
Лесной жеребенок приручается долго.
Даос уходит молча,
Приставив боевой шест к двери.
Путь в пустоте и темноте —
Как длинная аллея парка
Ноябрьским вечером.

****

Раскольников

'The lunatic is in my head
you raise the blade you make the change you 're —
arrange me till I'm sane'
«Лунатик в голове моей,
Ты поднял меч, ты рубишь и крошишь,
Покуда болен я»
'Brain Damage'

Ты пьёшь из бокала, Раскольников.
Ты спишь на холодном полу,
За стенкой соседка чахоточно кашляет
И мечется в легком бреду.
Ты небо украсил стеклянной решеткой,
Кровать из колючих причин,
Включая подвальную сырость комода,
Один, бесконечно один.
Читал оловянную ересь созвездий,
И ночи срывались в аллюр.
Трущобы давлеющий запах каверны,
Холодного золота сюр.
И гнусный пропойца честной Мармеладов
В кабак погружает, на дно.
А там вы солянки вкушаете сладость
И горькое пьете вино.
Но альфа трубит, а на шее — омега.
Дурацкая мысль на петле.
Какая любимая краска победы? Студент,
Вы лишь ставка в игре.
Божий день, повсеместная проза!
Не спеши, Родион, идиот,
Помнишь ты, на углу Комаровки,
Где старуха топор продает?
Дай мне сил, прободенная аура,
Плоти мышечной вялый протест,
А в глазах Лисаветы — осколок:
Где посеял, Раскольников, крест?
На подмостках записано небом,
Только совесть спроси, твою мать:
Кто здесь жертва в туманной обители?
И никто не хотел умирать.
Ждет свидетель — хромой Нейродюбель.
Ночь — дерьмо. А Порфирий, конечно же, бес.
Бахрома от кальсон кучерявится, точно
Ржавая кромка небес,
Пальцы греет крылатый расстрига.
На закат — сто аршин кумачу.
Все пройдет. Революция грянет
Глупой дыркой в старушечьем лбу!
Серп и молот, доска гробовая
Власть имеет, а кто-то забил.

Саша Чейз

Царство созданья себя

Таинственный свет полной луны
Заливает холодные окна.
Колеблется свет потускневшей свечи,
наводя состоянья покоя...
Лишь маятник лет, отбивая часы,
и странный портрет, что глядит со стены,
приятно пугает, и слышится
шорох у полуоткрытой двери...
Я слышу дыханье, я вижу движенье рук,
и вот уже шорох перерос в негромкий стук,
Я ждал этой встречи...
То — женщина в черном пальто
с портрета напротив,
я ждал этой встречи давно...
Мерцает огарок, и вот он потух навсегда.
Фиолетовый отблеск еще не осевшей луны...
и я иду к двери, я знаю,
что там будешь ты,
там царство блаженства,
там царство созданья себя,
там царство нирваны, и вот
ухожу я туда...
Ведет меня молча
та женщина в черном пальто...



Рисунок Умной Маши.

Джон Фёдорович Балтазаров

* * *

Вот умру — ну, поноют, поплачут,
На поминках моих посудачат
Через силу весной побатрачат,
Освежая зеленым оградку...
Гнусный камень, неровная кладка,
Тьфу ты, господи...

Под личиной, глядящей угрюмо,
Полстакана и сельдь с разговором,
А при жизни я пил лишь из рюмок
И закусывал лишь бутербродом
Как-никак — был эстетом.

Только им наплевать и похерить
Все мои повороты и драмы.

Вот-те в царство загробное двери,
Ты прошел? — закрываем амбарным,
И не вздумай вернуться.

Я ребенком мечтал о бессмертье,
Бесконечном жасминовом лете,
Но не вспомнит никто о поэте
Через лета на третью осень.

Мы судьбу и стращаем, и просим
Безответно.

27—28.08.91.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ЗАСНАВАЛЬНІК ГАЗЕТЫ — РЭКТАРАТ БЕЛАРУССКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

9 лютага
Зак. 650.
Т. 1000 экз.

Газета падпісана ў друк у 16.00.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 411—412
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
Т. М. КАЗАК